Пастар Вячаслаў Ганчарэнка: “Не трэба асабліва перажываць за будаўніцтва, важна ўбачыць жнів

Аўтар: Арцём Ткачук
16.05.2021 00:00



Пасля атэістычнага ліхалецця большасць хрысціянскіх супольнасцей прайшлі ці яшчэ праходзяць этап будаўніцтва святынь. З гэтым звязаны даўжэзны спіс праблем і выпрабаванняў. Сёння размаўляем пра гісторыю пратэстанцкай царквы “Новае Жыццё”. Пасля 30-ці гадоў дзейнасці яны былі пазбаўлены свайго малітоўнага дома і сталі “царквой без сцен”. ***– Пастар Вячаслаў, як узнікла Ваша царква? Распавядзіце крышачку пра гісторыю супольнасці?***

– У 90-ыя гады, калі Савецкі Саюз разваліўся, я і мае бацькі ўжо былі веруючымі людзьмі і належалі да Евангельскай Царквы. На той момант мне было 20 гадоў. Мы заўважылі, што людзі сталі цягнуцца да Бога, таму пачалі прапаведаваць, дзяліцца Евангеллем.

Стала прыходзіць шмат людзей. Спачатку мы арандавалі кінатэатры, дамы культуры. А ў 1992 годзе зарэгістравалі ў Мінгарвыканкаме нашу царкву. Веруючыя людзі памятаюць тыя часы – тады ўтваралася шмат цэркваў. †

– І пазней пачалася гісторыя з Вашым малітоўным домам?



– Як і ўсе нармальныя людзі, мы хацелі атрымаць зямлю пад будаўніцтва. Аднак нам адмаўлялі па розных прычынах. Апошнюю адмову атрымалі ў 2000 годзе: нам сказалі, што да 2010 года зямлі для будаўніцтва царквы не будзе. Тады мы вырашылі набыць закінуты кароўнік.

Супрацоўнічаючы з уладамі, чулі ад іх: “Так, набывайце будынак, а ўсё астатняе

Аўтар: Арцём Ткачук
16.05.2021 00:00

будзем вырашаць пазней”. У 2002 годзе кароўнік перайшоў ва ўласнасць нашай супольнасці. У мэце набыцця пазначылі: “Пад будаўніцтва культавага будынка”. Кароўнік нас, канешне, не цікавіў. Затым пачаўся працэс афармлення дакументаў. Было нават некалькі дазволаў на будаўніцтва там царквы.

Мы спачатку збіраліся на набытым участку ў палатцы. Часам проста на полі, у парку, у лесе. Аднак восенню 2004 года прайшоў ураган, сарваў шмат дахаў у нашым раёне, а палатку парваў на кавалкі. І мы не ведалі, дзе збірацца. Таму ў 2004 годзе было прынята рашэнне з верай увайсці ў той кароўнік.

Там дзе-нідзе не было сцен, дах свяціўся дзірамі, аднак мы за месяц зрабілі рамонт і сталі праводзіць там сходы. Тады нас пачалі штрафаваць, таму што будынак не з’яўляўся культавым. Мы плацілі штрафы, але ўсё роўна збіраліся.

Затым былы мэр Мінска прыняў рашэнне забраць у супольнасці зямлю з пазнейшым выкупам будынка. Крыху пасудзіліся, але нічога не дапамагло – нам далі 10 дзён, каб пакінуць пабудову. У кастрычніку 2006 года мы аб’явілі бестэрміновы пост перад Богам, а перад грамадствам – галадоўку. Усё працягвалася 23 дні, было шмат падтрымкі ад розных людзей і арганізацый. З гэтай нагоды мяне запрасілі ў адміністрацыю Прэзідэнта ды запэўнілі, што кіраўнік краіны ведае пра нас і падтрымлівае. “Вяртайцеся ў прававое поле, ідзіце ў суды, вам усё аддадуць”, – казалі нам. Мы спынілі галадоўку і з 2006 па 2009 год хадзілі па судах (было недзе каля 40-ка пасяджэнняў), але ўсё роўна засталіся вінаватымі.

Папярэдняе рашэнне пакінулі ў сіле – зямля не належыць царкве, будынак павінен быць вызвалены.

З 2009 года мы знаходзіліся вось у такім статусе.

Нас час ад часу наведвалі, патрабавалі пакінуць тэрыторыю. А ў лютым 2021 года царква была выселена з будынка.

– І які цяпер статус мае Ваша супольнасць? Не маеце будынка, але статус рэлігійнай арганізацыі застаўся?

– Так, мы рэлігійная арганізацыя “Царква «Новае Жыццё»”, але наш будынак належыць ЖРЭА. Мы вінныя дзяржаве 180 тысяч долараў, і калі выплацім гэтую суму, тады – як нам сказалі – Прэзідэнту накіруюць хадатайства, каб нам выдзелілі зямлю. Цяпер мы царква без сцен.

17 мая будзе тры месяцы, як молімся на вуліцы.

– Як змянілася жыццё супольнасці з практычнага пункту гледжання пасля таго, як Вы сталі “царквой без сцен”?

Пастар Вячаслаў Ганчарэнка: “Не трэба асабліва перажываць за будаўніцтва, важна ўбачыць жнів

Аўтар: Арцём Ткачук
16.05.2021 00:00





